Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 МАЯ 2016 г. АЎТОРАК № 82 (28192) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Запрашаем прадаўцоў латарэек і піва**

СТАР. 7



**Рэстаўрацыя: рамяство ці мастацтва?**

СТАР. 9



**Нафтавыя «арэлі». Што чакае «чорнае золата»?**

СТАР. 13

## З ВЕРАЙ, НАДЗЕЯЙ І АДКАЗНАСЦЮ



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 1 мая ў свята Уваскрэсення Хрыстовага наведаў Свята-Праабражэнскі храм у Шклове. Кіраўнік дзяржавы прысутнічаў на богаслужэнні, паставіў велікодную свечку, а затым цёпла пагаварыў з прыхаджанамі, жыхарамі раённага цэнтра, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка па добрай традыцыі на Вялікдзень наведвае храмы ў рэгіёнах. У гэтым годзе кіраўнік дзяржавы пабываў на сваёй малой радзіме. Разважляючы з землякамі, Прэзідэнт адзначыў, што яму добра вядомы праблемы Шклоўшчыны, людзей, якія тут жывуць.

Беларусь як суверэнная дзяржава яшчэ маладая, для яе развіцця ўжо нямала зроблена і яшчэ вельмі многае трэба зрабіць, сказаў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што адчувае вялікую адказнасць за беларускую зямлю. «Я нясу адказнасць перад людзьмі, якія даверылі мне гэту пасаду», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заклікаў беларусаў адказна працаваць на сваіх месцах дзеля агульнай справы, не перакладваючы на іншых свае праблемы і абавязкі. Дзяржава ж, у сваю чаргу, акажа неабходную падтрымку. Прэзідэнт лічыць, што кожнаму на сваім месцы трэба крытычна ацэньваць, перш за ўсё, вынікі ўласнай працы, думаючы над тым, як працаваць яшчэ лепш. «І ў нас тады ўсё будзе добра», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

У час наведвання храма Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць свяшчэннаслужыцелям за важкі ўклад, які яны разам з усімі ўносяць у стаңаўленне і развіццё Беларусі. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў прысутных са светлым Уваскрэсеннем Хрыстовым, пажадаў усім здароўя, доўгіх і шчаслівых гадоў жыцця, міру.

## Велікодны «карагод»



Юныя ўдзельніцы фальклорнага гурта «Крынічка» з палескай вёскі Хатынічы, што ў Ганцавіцкім раёне, наладзілі аднавяскоўцам сапраўднае свята, аднавіўшы ва ўсіх дэталях традыцыю валачобнікаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:**

*«У Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ішла гаворка аб маючай адбыцца палітычнай кампаніі як экзамене палітычнай культуры грамадства.*
*Але што такое палітычная культура? Гэта павага да чужога меркавання.*
*Краіна ідзе да таго, каб актывізаваць палітычную дзейнасць у сценах парламента менавіта за кошт розных пунктаў гледжання.*
*Актывізацыя палітычнай дзейнасці ўсё ж такі прадугледжвае абавязковую наяўнасць дыскусіі.*
*Трэба, каб людзі, абмяркоўваючы сумесны, хай і несупадаючы пункт гледжання, прыходзілі да адзіна правільнага рашэння, якое з'яўляецца дабром для грамадства».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19180,00 | ▼ |
| Еўра | 21972,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 295,22 | ▼ |
| Укр. грыўня | 765,58 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Актуальнае інтэрв'ю

**Анатоль КАЛІНІН:**



## «У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для інвестараў»

**Віцэ-прэм'ер Анатоль КАЛІНІН курыруе ва ўрадзе досыць шырокі спектр кірункаў: ад ЖКГ да інвестыцыйнай палітыкі. Усе яны вельмі блізка датычацца жыцця кожнага жыхара нашай краіны і надзвычай актуальныя для эканомікі ў цэлым. У эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» намеснік прэм'ер-міністра расказаў пра развіццё гэтых сфер, а таксама адказаў на шэраг іншых актуальных пытанняў.**

СТАР. 4

■ Экспертыза

## ГРАШОВАЯ БЯСПЕКА НА ПАЛЬЦАХ

**З першага ліпеня ў Беларусі з'явяцца новыя грошы. І чым бліжэй дэнамінацыя, тым больш пытанняў узнікае наконт хрумсткіх банкнотаў. Тычацца яны, безумоўна, і абароненасці грошай ад усемагчымых падробак. У сваю чаргу, карэспандэнты «Звязды» падсумавалі ўсе пытанні і звярнуліся з імі да супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, якія падрабязна расказалі, як новыя грошы можна будзе праверыць кожнаму чалавеку на сапраўднасць.**

СТАР. 5